ISSN 0234-1360

# РОДНАЕ СЛОВА

5

1994

Валеры БОЛБАС

# ПАД ЗНАКАМ ПЧАЛЫ

## Этыка-педагагічныя погляды Францішка Скарыны

*Да умножится яко дождь навчение мое*

З кн. «Другі закон», выдадзенай Ф. Скарынам у 1519 г. у Празе

Многія даследчыкі ўказваюць, што ў сінтэтычным па сваім характары светапоглядзе Францішка Скарыны дамінуе этычны аспект. І гэта не выпадкова. Спрадвеку на беларускіх землях культура развівалася ў такім кірунку (згадаем, для прыкладу, дзейнасць Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага). Выхаванне прыстойнай, цнатлівай асобы было заўсёдным клопатам нашых продкаў.

Амаль уся старадаўняя літаратура мела маральна-этычны ўхіл. Асаблівай папулярнасцю на Беларусі ў перыяд феадалізму карыстаўся нораваапавучальны зборнік выслоўяў і афарызмаў «**Пчела**», які істотна паўплываў на развіццё айчыннай этыка-педагагічнай думкі. І Францішак Скарына ў якасці ключавога вобраза-сімвала для сябе ўзяў менавіта пчалу — магчыма, таму, што галоўныя мэты яго дзейнасці пераклікаліся са зместам вышэйадзначанай кнігі.

Славуты палачанін справядліва лічыцца адным з заснавальнікаў нацыянальнага гуманістычнага руху. І хаця гуманізм Скарыны значна хрысціянізаваны (у параўнанні, скажам, з поглядамі заходнееўрапейскіх мысляроў гэтай плыні), але ён імкнуўся данесці першапачатковы, не скажоны афіцыйнай царквой, сэнс хрысціянскіх ідэй, імкнуўся ачалавечыць маральныя асновы грамадскага быцця. Глыбокае пераасэнсаванне маральных прынцыпаў і нормаў сярэднявечча вялося ім з пазіцый ранняга хрысціянства. Скарына спрабаваў уводзіць у этычныя пошукі свецкія, жыццесцвярджальныя пачаткі, а хрысціянскія духоўныя каштоўнасці ўхваляў на канкрэтных жыццёвых прыкладах.

### ЦАРСТВА НЯБЕСНАЕ, ЯКОЕ ЁСЦЬ ЗЯМЛЯ ЖЫВЫХ...

Многія сярэднявечныя багасловы прадпісвалі чалавеку на зямлі быць цярплівым, пакорлівым, сваім аскетызмам здабываць сабе лепшую долю на тым свеце. Зямное жыццё пры гэтым разглядалася толькі як часовае, неістотнае ў параўнанні з вечным, замагільным. На такіх поглядах грунтавалася ўся сістэма маральнага выхавання, якую Скарына прыняць не мог. Ф. Скарына арыентуе людзей і на рэальнасці *«сегосветнага жития»* (3, 21)*. На думку мысляра, чалавек яшчэ ў зямны перыяд існавання мае права на лепшую долю. У адрозненне ад артадоксаў хрысціянскай веры сярэднявечча, якія абяцалі людзям за праведнае зямное жыццё адплату на тым свеце, Скарына даводзіць, што дабрачынныя паводзіны самі па сабе з'яўляюцца вышэйшай узнагародай для душы чалавека. Сімвалічна гучыць яго думка ў падтрымку раннехрысціянскіх запаветаў аб тым, што *«царство небесное, еже ест земля живых»* (3, 41). Праўда, нябеснае царства — гэта для Скарыны не столькі канкрэтны, бачны вобраз, колькі стан чалавечай душы.

Характэрна, што ў арганізацыі шчаслівага жыцця, на думку Скарыны, многае залежыць ад самога чалавека, які можа, і нават павінен, удасканальваць сваю прыроду. Прычым мысляр неаднаразова падкрэсліваў, што для станаўлення асобы вызначальным з'яўляецца фармаванне духоўнага свету індывіда. Менавіта таму і здзейсніў ён выданне для ўсіх людзей тых біблейскіх кнігаў, змест якіх *«добрых обычаев и дел научаеть»* (1, 34).

Паводле поглядаў асветніка *«добронравием»* павінны быць прасякнуты ўсе сферы чалавечай дзейнасці, таму ён перасцерагаў, што *«без страху божия, без мудрости и без добрых обы-*

*Валеры Сяргеевіч Болбас — настаўнік Акцябрскай СШ № 3 (Гомельская вобл.), кандыдат педагагічных навук. Закончыў Гомельскі дзяржуніверсітэт (1970), аспірантуру пры ім (1993). Даследуе этыка-педагагічную думку Беларусі часоў Адраджэння.*

* Тут і далей пры спасылках першая лічба ў дужках азначае нумар крыніцы ў канцы артыкула, паводле якой зроблена цытата, другая — старонку.

*чаев не ест мощно почстиве жити людем посполите на земли»* (3, 22). Але дабрачыннасць, цнота не пáдае з неба, яна ёсць там, дзе ёсць маральнае выхаванне, хай сабе і не спецыяльна арганізаванае. У жаданні аказаць людзям дапамогу Скарына, *«будучи лекарем телесным доскональым, видяй вси речи телесные, иже суть суетны и минущи, возжеле быти лекарем душ наших»* (3, 108).

## НЯХАЙ ДАСКАНАЛЫМ БУДЗЕ ЧАЛАВЕК!

Праз асэнсаванне ролі маральнага выхавання (як у арганізацыі грамадскага жыцця наогул, так і ў станаўленні кожнай асобы ў прыватнасці) Скарына фактычна адрадзіў, напоўніў новым сэнсам тую галоўную выхаваўчую мэту, якая была вылучана і абгрунтавана яшчэ антычнымі філосафамі. Сэнс яе перадаецца грэцкім словам **«калакагатыя»**, што азначае «ідэал фізічнай і маральнай дасканаласці». Нагадаем, што ідэал гэты склаўся ў гамераўскую архаічную эпоху і меў вызначальны ўплыў на выхаваўчыя дактрыны старажытнасці. Аднак калакагатыя была адхілена сярэднявеччам і на працягу цэлых стагоддзяў амаль не згадвалася. Францішак Скарына быў у ліку тых, хто здолеў разгледзець карыснасць гэтай ідэі для гарманічнага развіцця чалавека, да таго ж не ў супярэчнасці з асноўнымі пастулатамі хрысціянскай веры. *«Да совѣршен будеть человѣк Божий и на всяко дѣло добро уготован, яко святый апостол Павел пишеть»* (3, 17) — такой бачыць асноўную задачу выхавання беларускі вучоны-педагог. Пры гэтым дасканаласць ім разумеецца ў першую чаргу як м а р а л ь н а я дасканаласць. У адной са сваіх прамоваў ён, згаджаючыся з Саламонам, расшыфроўвае гэтае паняцце: *«Бога бойся и заповеди его соблюди, той ест воистину совершенный человѣк»* (3, 26).

Такім чынам, паводле поглядаў Скарыны, маральна-ідэальны чалавек — той, хто дасканалы інтэлектуальна і маральна ды яшчэ й асветлены высокай духоўнасцю. Такое разуменне ідэалу чалавека з'явілася прынцыпова новым у параўнанні з пашыраным на той час, скажоным сярэднявечным аскетызмам і дагматыкай.

Скарына даволі прагрэсіўна для свайго часу вырашыў пытанне аб спалучэнні інтарэсаў грамадства і асобы. Як і патрабуе хрысціянская этыка, ён без усялякіх хістанняў ставіць грамадскае вышэй за асабістае: *«...Не толико бо сами собе народихомся на свет, но более ко службѣ божией и посполитого доброго»* (3, 71). Такія думкі не былі сугучнымі з філасофіяй індывідуалізму, пашыранай у эпоху заходнееўрапейскага Рэнесансу. Аднак мысліцель не адкідваў інтарэсаў адзінкавай канкрэтнай асобы і спрабаваў сумясціць арыентацыю індывіда на справы «агульнага дабра», карысныя для ўсіх — з яго жаданнем асабістага шчасця. Францішак Скарына жадаў, каб кожны чалавек і ўсе людзі *«добре жили на свете»* (2, 125).



**Аляксандр Дранец.** Францыск Скарына. Плакета, гіпс. 1986.

## ВЕРА БЕЗ СПРАВАЎ — МЁРТВАЯ

Звернем увагу і на тое, што Францішак Скарына падвяргаў сумненню арыстоцелеўскае разуменне дабрачыннасці як самамэты. Любая маральнасць, якая не праяўляецца ў рэальных практычных справах, ва ўдасканаленні зямнога жыцця,— нічога не варта. Вера павінна падмацоўвацца справамі, таму ўслед за Святым пісаннем Скарына прамаўляе: *«Вера бо без дел мертва ест»* (3, 105).

Сярод мэтаў маральнага выхавання філосафы і педагогі часта выдзяляюць і такую, як дасягненне асобаю духоўнай і маральнай свабоды. Раней царква ў значнай ступені рэгламентавала жыццё чалавека, яго ўчынкі і паводзіны, а ў ролі «пастыраў» чалавечага «статку» выступалі святары. Ф. Скарына адным з першых на беларускіх землях распачаў адыход ад сярэднявечнага разумення сутнасці свабоды. Пры гэтым ён прымаў асновы хрысціянскага веравучэння, але спрабаваў ачысціць яго, зняць залішнія абмежаванні з чалавека.

Мысляр па-свойму зразумеў «залатое правіла» маральнасці і выклаў яго такім чынам: *«То чинити иным*

*всем, что самому любо от иных всех, и того не чинити иным, чего сам не хощеши от иных имети»* (3, 62). Ён угледзеў у гэтым прадпісанні магчымасць для чалавека самому ацэньваць і самому рэгуляваць маральнасць сваіх паводзінаў. Так Скарына наблізіўся да разумення таго, што чалавечая мараль бярэ пачатак унутры самога чалавека, у яго сэрцы, у той час як асноўныя хрысціянскія дактрыны сярэднявечча вытлумачвалі мараль «як нешта знешняе, фармальнае, навязанае чалавеку» (2, 118).



**Юры Кухараў. Беларускі першадрукар Францыск Скарына. Афорт. 1980.**

## ПАЛЮБІЦЬ БЛІЖНЯГА

Як вядома, змест маральнага выхавання цалкам залежыць ад маральнавыхаваўчых мэтаў. У феадальным грамадстве кожнае саслоўе мела свой, выразна размежаваны, іерархічна выбудаваны кодэкс духоўных каштоўнасцяў. Скарына прапанаваў перагледзець гэтую іерархію маральных рысаў і якасцяў, паспрыяць усталяванню ў грамадстве такой сістэмы дабрачыннасцяў, складнікі якой павінны быць уласцівы кожнаму чалавеку, які імкнецца быць духоўным, незалежна ад яго саслоўна-класавай прыналежнасці.

На адно з першых месцаў у новай сістэме дабрачыннасцяў Скарына выводзіць чалавекалюбства. Дзеля ўзвышэння гэтай маральнай якасці мысляр згадвае біблейскі запавет: *«Возлюбиши ближнего своего, яко сам себе»* (3, 62). Але асветнік-гуманіст пашырыў сферу дзеяння гэтага запавету як на *«простого и посполитого человека»*, так і на людзей іншых канфесій — *«иноверцев»*. Скарына павучаў: *«...Каждый хрестианин* [...] *наиболей любовь ко всим да соблудаеть, еже ест совершена над все иные дарования, без нея же ничто проспешно ест»* (3, 112).

У той жа час мысляр-педагог разумеў, што **навучыцца любіць усіх немагчыма без любові да свайго народа, да сваёй Радзімы.** Скарыназнаўцы сцвярджаюць, што само паняцце «айчына» як філасофска-этычная катэгорыя было ўпершыню ўведзена ў грамадска-педагагічны ўжытак на Беларусі вялікім палачанінам. Вытокі *«любви отчины»* Ф. Скарына ілюструе хрэстаматыйным выказваннем, у якім даволі трапна і вобразна тлумачыцца, чаму людзі *«игде зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають»* (1, 39).

Не менш важнай дабрачыннасцю, чым чалавекалюбства, Скарына лічыць справядлівасць. Паводле разумення мысляра яна трымаецца, з аднаго боку, на духоўна-маральных законах, што дадзены Богам і *«в серци единого кажного человѣка»*, якія ён атрымлівае ад нараджэння, і, з другога боку, на зборы тых законаў, што арганічна ўваходзяць у *«книги Моисеовы и светое Евангелие»*,— закону, які *«от людей уставленый»* (4, 136—137). Вучоны лічыць, што дзеля трыумфу справядлівасці на зямлі было б дастаткова **маральных прадпісанняў,** якіх кожны сапраўдны хрысціянін няўхільна прытрымліваецца. Аднак ёсць катэгорыя людзей, чые паводзіны патрабуюць кантролю і рэгулявання з боку грамадства. Таму і ствараюцца **законы пісаныя,** у асноўным *«для людей злых, абы боячися казни, усмирили смелость свою и моци не имели иным ушкодити, и абы добрыи межи злыми в покои жити могли»* (4, 138).

Справядлівасць для Скарыны — гэта такая агульначалавечая маральная каштоўнасць, якая ўплывае не толькі на паводзіны ўнутры саслоўяў, сацыяльных групаў і іншых людскіх супольнасцяў, але і падпарадкоўвае сабе выключна ўсе грамадскія адносіны. Мысляр быў перакананы ў тым, што імкненне да справядлівасці ў спалучэнні з чалавекалюбствам складаюць аснову *«крепости духовной»* любога грамадства.

Падобным жа чынам трактуюцца Скарынам праўдзівасць, сумленнасць, шчодрасць, міласэрнасць, спагадлівасць, дабрыня, сціпласць, мужнасць і іншыя маральныя якасці. **Змест маральнага выхавання** набывае ў Скарыны (у адрозненне ад тагачасных феадальна-рыцарскіх уяўленняў) больш канкрэтны, сацыяльна арыентаваны характар. Павевы новага часу

скіроўваюць яго і да асэнсавання такой маральнай якасці, як пачуццё ўласнай годнасці. Пачуйма, наколькі прыўзнята, высакародна і прыгожа гучаць ягоныя словы: *«Я, Францишек, Скоринин сын с Полоцка, в лекарскых науках доктор»* (3, 20).

*«Добрые нравы»*, на думку Ф. Скарыны, пашыраюцца, калі дзеці навучаны любіць сваіх бацькоў, клапаціцца аб іх. Мысляр-педагог раіў так уладкоўваць сем'і, каб *«чада* [...] *слухали и честовали родителей своих»* (3, 116).



Эдуард Астаф'еў. Францыск Скарына. Плакета, гіпс. 1980.

Набліжэнне эпохі дзелавых, энергічных людзей (капіталізму) выклікала ў грамадстве патрэбу асабліва ўзвысіць працавітасць — маральную якасць, якая ў пашане ў народнай педагогіцы беларусаў, у хрысціянстве. У сваіх творах Скарына неаднаразова паўтарае раннехрысціянскае настаўленне: *«Пребывати* [...] *во деланіи руками»* (3, 118). Як прыклад таго, што любоў да працы робіць гонар і мужыку, і пану, філосаф прыводзіць тыя краіны з біблейскіх сюжэтаў, дзе *«мнози цари со тружанием поживше»* (3, 41).

## ДЗЕ — ПРАЎДА, ДЗЕ — «КРИВДА»...

Вызначэнне зместу маральнага выхавання амаль поўнасцю залежыць ад таго, як самі людзі размяжоўваюць дабро і ліха, дабрачыннасці і заганы. Часта дапамагалі адрозніць *«добронравие»* ад *«злонравия»* рэлігійна-духоўныя імператыўныя пастулаты. Чалавеку заставалася толькі засвоіць біблейскія прадпісанні ды кіравацца імі ў жыцці. Аднак новай маральнасці (на аснове ўласнай самаацэнкі, якую прапанаваў мысляр) цесна ў «пракруставым ложы» царкоўных прадпісанняў, і ў прамове *«во всю Библию»* ён заклікае суграмадзянаў вучыцца *«розознати правду от кривды»* (3, 46).

Беларускі мысляр раскрываў сутнасць не толькі станоўчых маральных якасцяў, што павінны быць уласцівы кожнаму чалавеку, але і адмоўных рысаў. Адмоўнае, ліхое, што ёсць у чалавеку ці грамадстве, не дазваляе дасягаць духоўных вяршыняў, але ж і з'яўляецца тымі прыступкамі, пераадоленне якіх маральна гартуе як асобу, так і грамадства ў цэлым. Скарына адзначаў, што *«единый кажный человек, имея розум, познаеть, иже непослушание, убийство, прелюбыдеание, ненависть, татьба, несправедливость, злоимание, неволя, досаждение, гордость, злоречение, нелютость, клеветание, зависть и иная тым подобная злая быти»* (3, 62).

Вялікая заслуга Францішка Скарыны ў тым, што многія маральныя каштоўнасці ён пераасэнсаваў на гуманістычна-дэмакратычны лад, іншыя ж напоўніў новым зместам, надаў ім агульначалавечы характар.

## ШЛЯХІ «НАВЧЕНИЯ ДОБРОНРАВИЮ»

Францішак Скарына ў сваёй творчасці імкнуўся выявіць шляхі *«навчения добронравию»*. Многія з прапанаваных ім метадаў і сродкаў знайшлі адлюстраванне ў айчыннай тэорыі маральнага выхавання і не страцілі сваёй значнасці для сучаснай педагогікі.

У якасці галоўнага шляху ў арганізацыі маральнага выхавання мысляр называе асвету людзей. Асновай для засваення добрых нораваў і звычаяў ён лічыць веды і розум, і таму ў іх значна больш каштоўнасці, *«нежели во тленных великих царскых сокровищах»* (3, 24). Рэнесансна-гуманістычнае гучанне маюць наступныя радкі з прадмовы Скарыны, дзе ён спрабуе паяднаць хрысціянскія і адраджэнскія ідэі: *«Мудрость якобы моць в драгом камени, и яко злато в земли, и ядро в ореху. Кто ю знайдеть, сей знайде милость, и достанеть благословения от господа, и приидеть к нему все доброе посполу с нею. Хвала и честь безчисленая моцию ея, она убо есть мати всех добрых речей и учитель всякому доброму умению»* (2, 127; 3, 22).

Важнейшым сродкам для набыцця мудрасці Францішак Скарына лічыў кнігу, з якой і дзеці, і дарослыя могуць чэрпаць *«добрые нравы, яко бы со источника»* (3, 18). Свяшчэннае пісанне, паводле першадрукара,— найважнейшая крыніца маральных нормаў і сродак маральна-духоўнага вы-

хавання, таму *«пожиточьны же суть сие книгы чести всякому человѣку: мудрому и безумному, богатому и вбогому, младому и старому, наболѣй тым, они же хотят имети добрые обычаи и познати мудрость и науку»* (3, 22). Выхаваўча-прагматычныя матывы чуюцца ў радках мысляра з паўторам думкі Цыцэрона аб тым, што дом, у якім няма кнігі, падобны на цела, якое пазбаўлена душы.

Францішак Скарына скіроўваў сваіх чытачоў на напружанне ўласных сілаў дзеля свайго духоўнага развіцця, раскрываў выключную ролю самавыхавання ў гэтым працэсе. Асветнік быў упэўнены, што маральнае ўдасканаленне асобы пачынаецца з пазнання чалавекам свайго ўнутранага свету, ён пісаў: *«...Иже ест наивышшая мудрость розмышлѣние смерти и познание самого себе»* (3, 20).

Высока цаніў Францішак Скарына і сілу ўласнага прыкладу (дарэчы, і прыклад яго падзвіжніцкага жыцця варты пераймання), указваў, напрыклад, што кніга «Ісус Сірахаў» *«приводит нас к святости и к добрым делом путем прикладу, припоминаючи нам жития святых»* (1, 35; 3, 25). Згаданыя ім вобразы біблейскіх герояў, як меркаваў мысляр, павінны стаць добрым прыкладам для людзей у працэсе іх маральнага ўдасканалення.

Пры распрацоўцы шляхоў набыцця высокіх маральных рысаў і якасцяў чалавекам асветнік аддае належнае розуму, але і прызнае значны ўплыў на паводзіны асобы, яе ўчынкі чалавечых пачуццяў. Ф. Скарына падкрэслівае, што менавіта праз сэрца праходзіць шлях да маральнага ўдасканалення, бо многія маральныя паняцці закладзены *«в серци одиного кажного человѣка»* (3, 62). Вось чаму асветнік абгрунтоўвае думку, што мастацтва не толькі прыносіць эстэтычную асалоду, але і дапамагае чалавеку стаць гуманным, чалавечным. Напрыклад, псальм *«тело пѣнием веселить, а душу учить»* (3, 17). Прыгожае Скарына атаясамлівае з маральнымі дабрачыннасцямі, і, наадварот, зло і амаральнасць як бы стаяць у адным шэрагу з паняццямі «агідны, брыдкі» і г. д.

Этыка-педагагічныя ідэі знакамітага вучонага адпавядалі духу Адраджэння (што адбывалася тады, як і паўсюль у Еўропе, на землях Вялікага княства Літоўскага) — таму і знаходзілі водгук як на Радзіме мысляра, так і за яе межамі. І ў наступныя эпохі да духоўнай спадчыны першадрукара звярталіся тыя, хто шукаў шляхі да больш дасканалай арганізацыі жыцця, імкнуўся ўзвысіцца духоўна. А сёння, калі наша грамадства робіць своеасаблівую «рэвізію» маральных каштоўнасцяў, маральна-выхаваўчыя ідэі вялікага суродзіча зноў захапляюць нас сваёй моцай і значнасцю.

ЛІТАРАТУРА


1. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: Избранные произведения XVI — начала XIX вв.— Мн., 1962.
2. Падокшын С. А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага.— Мн., 1990.
3. Скарына Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія.— Мн., 1990.
4. Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. даведнік.— Мн., 1988.





*Наш каляндар*

## СТАНІСЛАЎ МАНЮШКА (1819—1872)

Любая творчасць, пазначаная талентам, амаль заўсёды пачынаецца з музыкі, з рытму. Пра гэта сведчаць шматлікія прызнанні паэтаў, мастакоў і нават вучоных... Высокія і чыстыя пачуцці, парыванні — хай кожны прыгадае — таксама суправаджаюцца калі не прыемна-напеўным гучаннем, то якойсьці мелодыяй, часта незнаёмаю. Таму, відаць, можна сцвярджаць, што любы талент, любое высакароднае памкненне — музычныя ў сваёй аснове. Таму, мабыць, кампазітары найбольш далучаны да музычных пачаткаў свету, а праз гэта — да ўдзячнай памяці людзей, да вечнасці...

У кастрычніку 1856 г. у Мінску праходзіў губернскі з'езд шляхты, што на нейкі час падначаліў сабе ўклад мясцовага жыцця. У гістарычнай жа перспектыве гэты з'езд раскрыў часовасць і бытавы, карысліўы сэнс палітычнай валтузні ды правінцыйнасць свецкіх інтрыг. Сёння гэта адышло на другі план, уяўляецца дробязным, саступіўшы месца таму, што было залежным і прымеркаваным да падзеі гу-